**Шапавалава, А.** Афганістан стаў школай мужнасці / А. Шапавалава // Пастаўскі край. — 2008. — 13 лют. — С. 4.

## АФГАНІСТАН СТАЎ ШКОЛАЙ МУЖНАСЦІ

***Ні адзін з узброеных канфліктаў, у якіх даводзілася прымаць удзел савецкім, а пасля расійскім войскам за апошняе стагоддзе, не выклікаў столькі супярэчлівых, неадназначных ацэнак у грамадстве, як вайна ў Афганістане. Адны лічылі яе неабходнай, іншыя ж, наадварот, бессэнсоўнай. У кожнага, каму давялося пабываць там ці хто меў нейкае дачыненне да тых падзей, свае адносіны да гэтай вайны, свая праўда пра яе…***

Не бярэцца рабідь катэгарычных высноў і падпалкоўнік запасу Анатолій Мікалаевіч Кулакоў, які знаходзіўся ў Афганістане з лістапада 1981-га па люты 1984-га. «Для дзяржавы гэта вайна, напэўна, была патрэбна: Савецкі Саюз павінен быў засцерагчы ад небяспекі сваю паўднёвую граніцу, інакш ля яе стаялі б амерыканцы. Але наша знаходжанне ў Афгане было марным – кантраляваць яго вельмі складана, а заваяваць наогул немагчыма, – кажа ён. – Але вельмі многіх Афганістан сфарміраваў як асоб, ён стаў сапраўднай школай мужнасці. Там зусім у іншым аспекце раскрылася мужчынская дружба і праявіліся асобасныя якасці чалавека».

Як кожны, хто прайшоў Афганістан, сваё жыццё Анатолій Мікалаевіч дзеліць на два перыяды: да вайны і пасля яе. Сама ж вайна займае асобнае месца, і ўспамінаць пра яе не заўсёды хочацца. У жыцці з прыстаўкай «да» была даволі паспяховая ў плане кар'еры служба ў Пскоўскай паветрана-дэсантнай дывізіі на пасадзе камандзіра самаходнай артылерыйскай батарэі. Была сям'я, жонка і двое маленькіх дзяцей... І раптам загад, усім саставам батарэі адправіцца ў Афганістан.

– Пасля прылёту ў Кабул нам далі месяц на падрыхтоўку тэхнікі.

І ўжо ў снежні 1981-га мы пачалі выконваць баявыя задачы, – расказваў Анатолій Мікалаевіч. – Займаліся зачысткай тэрыторыі і блакіроўкай афганскіх банд-фарміраванняў: шукалі склады варожай зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў і знішчалі іх. Непасрэдна як артылерысты падаўлялі агнявыя кропкі праціўніка і суправаджалі пехацінцаў артылерыйскім агнём. Не раз даводзілася бачыць смерць таварышаў і самому твар у твар сустракацца са смерцю. І я ніколі не паверу таму, хто скажа, што не адчуваў страху, калі на яго напраўлялі дула аўтамата. Гэта вельмі страшна. Увогуле, пытанне там стаяла так: або заб'еш ты, або заб'юць цябе. Калі ў плане ўзбраення мы пераўзыходзілі праціўніка, дык душманы былі ў выйгрышы ў тым, што заўсёды добра ведалі мясцовасць – кожную сцяжынку ў гарах і, як правіла, з'яўляліся ў нас з-за спіны. Да таго ж многія з іх днём выглядалі звычайвымі сялянамі з матыкамі ў руках, а з наступленнем цемры бралі ў рукі зброю і стралялі ў нас. Былі моманты, калі ў думках развітваўся з жыццём. І тады як за саломінку хапаўся: пачынаў прасіць абароны ў Бога, хоць усё жыццё быў атэістам і не ведаў малітваў. А пасля вяртання на Радзіму першае, што зрабіў, – пайшоў у царкву і паставіў свечку.

За тры з лішнім гады, праведзеныя ў Афганістане, А. М. Кулакову давялося ўдзельнічаць у сотнях баёў, якія ніколі не сатруцца з памяці. Многія помняцпа да драбніц. Напрыклад, як аднойчы іх, групу з 24 чалавек, якія павінны былі знішчыць варожыя медыцынскія склады ў правінцыі Гардэз, высадзілі з верталётаў не зусім там, дзе планавалася, бо на зямлі вяліся баявыя дзеянні, і яны сустрэліся з атрадам душманаў прыкладна ў 140 чалавек. Пасля таго бою з 24 іх засталося

ўсяго 6. За яго Анатолій Мікалаевіч узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Мае таксама ордэн «За службу Радзіме» III ступені, баявы знак «За размініраванне», шмат пасляваенных ордэнаў і медалёў.

Лёс быў добразычлівы да А. М. Кулакова. Яму пашчасціла вярнуцца з той вайны жывым, хоць і быў двойчы цяжка паранены. Вярнуліся з Афганістана таксама яго бацька і малодшы брат. На Радзіму Анатолій Мікалаевіч прыехаў ужо ў званні капітана на пасаду начальніка штаба дывізіёна артылерыйскага палка, які размяшчаўся ў горадзе Яфрэмаў і ўваходзіў у склад Тульскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Праз год стаў камандзірам дывізіёна, а затым – намеснікам камандзіра палка. У 1987 годзе яго назначылі ваенным камісарам Шумілінскага раёна, у 1989-ым перавялі райваенкомам у Паставы, дзе праслужыў да верасня 2000 года. Цяпер Анатолій Мікалаевіч на пенсіі.

Азіраючыся на пражытае, ён без асобага шкадавання ставіцца да таго, што ў яго лёсе быў Афганістан. Лічыць яго вельмі важнай школай для любога ваеннага, а тым больш афіцэра. І заўсёды па-асабліваму адносіцца да людзей, якія былі там, – яны многае бачылі і ведаюць цану сапраўдным каштоўнасцям.

**А. Шапавалава**